*Т.І. Жыркевіч* (Магілёў)

# М. БАГДАНОВІЧ І Дз. БАЯДЖЫЕЎ: ДА ПЫТАННЯ ЛІТАРАТУРНЫХ СУВЯЗЕЙ

Успрынящце творчасці пісьменніка іншанацыянальнымі культурамі ажыццяўляецца па некалькіх напрамках: праз пераклады, крытычныя артыкулы, прысвечаныя дадзенаму пісьменніку, праз выяўленне некаторых тыпалагічных падабенстваў з прадстаўніком роднай культуры. Аб некаторых тэматычных падабенствах разважае ў артыкуле “Двойният живот на Максим Богданович” Сімяон Уладзіміраў. Ён знаходзіць шмат агульнага ў паэтычным складзе беларускага класіка з некаторымі балгарскімі паэтамі, у прыватнасці з Дзімітрам Баяджыевым.

Беларусь і Балгарыю аб’ядноўваюць шмат з’яў, у тым ліку і агульныя тэндэнцыі развіцця ў пэўны літаратурны перыяд, у прыватнасці напачатку XX ст., калі распаўсюджванне атрымаў сімвалізм, калі прадчуваннем змен дыхалі ўсе больш-менш значныя паэты.

онный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кул

Дзімітр Баяджыеў (1880 – 1911) – балгарскі паэт, творчасць якога ажыццяўлялася ў рамках сімвалісцкага напрамку.

Станаўленне балгарскага сімвалізму адбывалася паступова, аднак у літаратуразнаўстве прынята лічыць, што пачатак айчыннаму сімвалізму паклалі творчасць П. Яварава і Т. Траянава. У нарысе "Кароткая гісторыя балгарскай паэзіі" Гаа Мілеў пісаў: "Сімвалісты ставяць перад сабой дзве задачы: давесці тэхнічнае майстэрства да віртуознасці і ўзбагаціць гаму матывамі балгарскай паэзіі". Сацыяльнай глебай для з'яўлення сімвалізму ў Балгарыі стаў крызісны стан грамадства, што выявілася ў вострых канфліктах, падзенні маральных асноў. Балгарскія сімвалісты прыдавалі значэнне самасцвярджэнню асобы, не прымаючы штодзённую пасрэднасць. У эстэтычным плане яны супрацьстаялі традыцыйным рэалістам, у сістэме вобразаў галоўную ролю адводзілі сімвалу і алегорыі, а таксама клапаціліся аб музычнасці верша.

Балгарскія паэты абапіраліся на вопыт французскіх, нямецкіх і рускіх сімвалістаў канца XIX – пачатку XX ст. Аднак у іх усё ж не было рэзкага разрыву з рэалістычнымі і рамантычнымі традыцыямі, як у заходнееўрапейскіх сімвалістаў. У іх творах было больш канкрэтнай вобразнасці (нават пры адлюстраванні таго свету), рэалістычнай прыземленасці і большая ўвага надавалася псіхалагічнай характарыстыцы чалавека, стану лірычнага героя.

Росквіт таленту і М. Багдановіча, і Дз. Баяджыева выпаў на самыя супярэчлівыя, але вельмі яскравыя гады развіцця літаратуры. Жывыя і чулыя на ўсе праявы жыцця паэты імкнуліся да ўспрыняцця новых эстэтычных прынцыпаў, якія нараджаліся ў сусветным літаратурным працэсе. Жаданне засвоіць новыя еўрапейскія ўяўленні і прыстасаваць іх да роднай культуры дало магчымасць паэтам выразіць найбольш поўна сваё светаадчуванне, унутраны настрой душы.

Літаратурнае падабенства творчасці паэтаў у рамках сімвалізму можна прасачыць па агульнасці тэм, матываў, вобразаў у лірыцы.

Абодвух славянскіх паэтаў аб'ядноўвае тэма драматызму чалавечага жыцця. У Багдановіча яна паўстае з-за ранняга разумення асуджанасці перад невылечнай хваробай. У Баяджыева – у выніку асабістай драмы з-за безадказнага кахання. Адсюль пачуццё разрыву з бязрадаснай рэчаіснасцю, пакуты ад трагічных прадчуванняў, абвостранае ўспрыманне хуткаплыннасці часу, чалавечай асуджанасці перад "канцом веку".

Абставіны жыцця ў сукупнасці з захапленнем сімвалізмам абумовілі з'яўленне ў лірыцы паэтаў агульнай для іх тэмы смерці.

Элегічнасць стала адным з самых характэрных момантаў паэзіі Дз. Баяджыева. Але вобраз смерці ўзнікае пад уплывам асобных перажыванняў, ад невырашальнага канфлікту самаго паэта з сучаснасцю ("Элегія"). Лірыка Дз. Баяджыева адлюстроўвае складаны, пакутлівы духоўны свет мастака, які імкнецца набыць жаданае шчасце са сваёй каханай, але натыкаецца на



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

халоднае непаразуменне. У паэзіі Дз. Баяджыева адчуваецца глыбокая пяшчота (“Пісьмо”, “Марсэль”), яе адрознівае спавядальны тон і гранічны драматызм, народжаны ўяўленнем аб асуджанасці асобы на адзіноцтва і пакуты: “жыццё – гэта кашмар недарэчны і вялікі” (“Заглушаны крык”). І асабістая драма паэта абарвалася самагубствам.

Паэзія Багдановіча – гэта пратэст супраць смерці, непрыняцце яе як страшэннай несправядлівасці, калі ў небыцці знікае чалавек з яго унікальным светаадчуваннем, непаўторнасцю думак і пачуццяў. Нават сярод разважанняў пра непазбежнасць смерці прасочваецца думка пра значнасць чалавечага жыцця: “Жывеш не вечна, чалавек, – / Перажыві ж у момант век!”

Такім чынам, М. Багдановіч і Дз. Баяджыеў, зведаўшы пэўныя ўплывы сімвалістычнай распрацоўкі тэм і матываў, суадносячы з сваімі ўласнымі эстэтычнымі поглядамі, стварылі непаўторныя сістэмы паэтыкі. У абодвух сімволіка далёкая ад наўмыснасці, абстрактнай невыразнасці, туманнага іншасказання. У іх адчуваецца зямная сіла пачуццяў і слоў, а за сімваламі стаяць канкрэтныя радасць і нуда, жыццё і пакуты.

**Літаратура**

1. **Владимиров, Симеон.** Двойният живот на Максим Богданович / Симеон Владимиров. – София, 1984.
2. **Хаджикосев, Симеон.** Българският символизъм / Симеон Хаджикосев. – София, 1979.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А. А. Кулешова